4. О радио «Unistar» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://unistar.by/radio/on-the-radio/. – Дата доступа: 11.12.2021.
5. Популярные форматы радиостанций на современном рынке [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://umediagroup.com.ua/radio-formats. – Дата доступа: 18.12.2021.
6. Плей-лист Мелодии Века [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://onlineradiobox.com/by/melodiiveka/playlist. – Дата доступа: 07.12.2021.
7. Радиовещательные технологии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.radiostation.ru/music/format.html. – Дата доступа: 02.12.2021.
8. Ретро FM [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://emg.fm/asset/3. – Дата доступа: 11.12.2021.
9. Рейтинг радиостанций [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.radioreklama.biz/rejtingi-1-volna-kiev-sutochnyj-oxvat/. – Дата доступа: 07.12.2021.
10. Форматы радиостанций / Guzei.com [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://guzei.com/radio/journal/article/format.php. – Дата доступа: 02.12.2021.

## КАШТОЎНАСЦЬ КУЛЬТУРЫ Ў КАНТЭКСЦЕ ГІСТОРЫІ

**Н. А. Зубчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Значэнне культуры ў жыцці грамадства і краіны пераацаніць немагчыма. Гэта аснова сацыяльнага і палітычнага развіцця. Менавіта культурны складнік фарміруе асобу, вызначае яе месца ў соцыуме. Страты ў духоўнай сферы дзяржавы заканамерна адбіваюцца на іншых аспектах яе жыццядзейнасці.

На розных этапах беларускай гісторыі адносіны да духоўнай спадчыны складваліся па-рознаму. Тым не менш, менавіта праз культуру фарміравалася беларуская народнасць, а потым і нацыянальная дзяржаўнасць. Першыя гістарычныя помнікі (Сафійскі сабор у Полацку (XI ст.), крыж Ефрасінні Полацкай (XII ст.)), імёны беларускіх асветнікаў (Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына) сталі

сімваламі нашай краіны і дзяржаўнасці. Праз дасягненні навукі і культуры ў XVI ст. беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага далучыліся да сусветнага цывілізацыйнага развіцця. Выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны для беларусаў стала пачаткам новай эпохі ў дзяржаўным і грамадскім развіцці. Менавіта на беларускай мове (царкоўны варыянт старабеларускай мовы) выйшла першая друкаваная кніга на тэрыторыі ўсходніх славян («Псалтыр», 1517 г.), быў падрыхтаваны Статут Вялікага княства Літоўскага (1529 г.), які да нашага часу лічыцца лепшым узорам еўрапейскага прававога пісьменства.

Уключэнне беларускіх земляў у склад Рэчы Паспалітай (1569 г.), а потым і Расійскай Імперыі (1772 г., 1793 г., 1795 г.) не спрыяла іх культурнаму і сацыяльна-эканамічнаму развіццю. Тым не менш, ва ўмовах татальнай паланізацыі, а потым і русіфікацыі, поўнай забароны ўжывання нацыянальнай мовы народ захаваў каштоўную этнічную спадчыну. На яе аснове ў пач. XX ст. адбылося нацыянальна-культурнае адраджэнне, завяршыўся працэс фарміравання беларускай нацыі.

У 1906 г. убачылі свет першыя легальныя газеты на беларускай мове – «Наша Доля» і «Наша Ніва». Увогуле, выхад гэтых выданняў для беларускай гісторыі абсалютна ўнікальная з’ява. У «нашаніўскае дзесяцігоддзе» былі закладзены асновы нацыянальнай літаратуры, мовы, асветы і адукацыі, гісторыі, сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны. Для Беларусі пачатак XX ст. стаў яшчэ і перыядам актыўнага станаўлення журналістыкі. Разам са стварэннем дзяржавы складваецца і сістэма сродкаў масавай інфармацыі, якая фарміруе свядомасць новага грамадства ў адпаведнасці з запатрабаваннямі часу.

Няпростым і даволі супярэчлівы этапам у гісторыі Беларусі стаў савецкі перыяд. Развіццё нацыянальнай культуры не аднойчы апыналася пад пагрозай. Тым не менш, нават у гэтым моцным супрацьстаянні культурная прастора папаўнялася новымі творамі літаратуры, музыкі, жывапісу, архітэктуры і інш.

У шэрагу дасягненняў XX ст. нельга не назваць актыўнае развіццё радыё (1925 г. – пачатак рэгулярнага радыёвяшчання). Праз радыё беларуская нацыянальная культура атрымала магчымасць стаць больш даступнай да народа. Першыя выпускі адбываліся ў прамым

эфіры, гуказапіс з’явіўся значна пазней. Сацыяльна-палітычная інфармацыя трансліравалася праз радыёгазеты, а таксама іншыя жанры і формы. Аднак для папулярызацыі нацыянальнай культуры беларускае савецкае радыё зрабіла сапраўды шмат. На пачатку станаўлення гэтаму спрыяла палітыка беларусізацыі, якая рэалізоўвалася ў БССР у 1920-я – 1930-я гг. Так, Дзяржаўны сімфанічны аркестр Беларускага радыё трансліраваў канцэрты, знаёмячы слухачоў з творамі выдатных кампазітараў свайго часу. Карыстаўся асаблівай папулярнасцю жанр радыёспектакля. У літаратурныя гасцёўні сваіх слухачоў запрашалі беларускія паэты і пісьменнікі. У фондах Беларускага радыё захоўваюцца першыя яго галасы – Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, П. Глебкі, М. Лынькова і многіх іншых прадстаўнікоў беларускай культуры. Такім чынам, у савецкі перыяд на радыё былі закладзены традыцыі культурнага вяшчання, выпрацавана метадалогія, сфарміравана сапраўдная прафесійная школа. Нягледзячы на складаныя палітычныя і ідэалагічныя ўстаноўкі, пераважная большасць радыёперадач, не толькі культуралагічнага зместу, гучала па-беларуску.

Пераход да новага этапу развіцця на мяжы XX–XXI стст., тэхналагічная трансфармацыя інфармацыйнай прасторы, заканамерна паўплывалі на ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства. Асаблівую занепакоенасць выклікае ў гэтым кантэксце менавіта духоўны складнік сучасных пераўтварэнняў. Функцыянаванне ў рынаўных умовах патрабуе рэалізацыі толькі адной мэты – прыбытку. Менавіта культурная сфера ў дадзеным працэсе апынулася абсалютна безабароннай. «Добрае і вечнае» па аб’ектыўных прычынах не заўсёды сёння знаходзіць дарогу да свайго чытача, слухача, гледача. Тым не менш, як і ў ранейшыя няпростыя для беларускай гісторыі часы, грамадства старанна захоўвае і развівае лепшыя культурныя набыткі. Пацвярджэннем гэтаму з’яўляецца радыёканал «Культура». На працягу дваццаці год у эфіры вядзецца папулярызацыя нацыянальнай культуры. Вялікую цікавасць выклікаюць гістарычныя матэрыялы з фондаў Беларускага радыё. Рэгулярна з’яўляецца новы сучасны кантэнт. Вяшчанне на працягу поўных сутак сведчыць аб пастаянным росце колькасці неабыякавых і зацікаўленых пытаннямі культуры людзей. Новыя тэхнічныя магчымасці дазваляюць весці перадачы ў прамым эфіры. Цікава, але сёння, як і шмат год

таму, карыстаюцца папулярнасцю прамыя трансляцыі канцэртаў, радыёспектакляў, вечароў радыё, конкурсаў і інш. мерапрыемстваў і праектаў. На Беларускім тэлебачанні канал «Беларусь 3» паспяхова фарміруе ўласную аўдыторыю. Спецыялізаваныя літаратурна-мастацкія выданні краіны асвойваюць новыя медыйныя платформы і маюць свайго пастаяннага чытача.

Безумоўна, у сучасных умовах жорсткай рыначнай канкурэнцыі вельмі складана развівацца менавіта сферы культуры. Тым не менш, значная частка грамадства выдатна разумее, што яго будучыня немагчыма без захавання і памнажэння набыткаў нацыянальнай культуры. Год гістарычнай памяці дае магчымасць кожнаму з нас звярнуцца да гісторыі краіны, пераасэнсаваць некаторыя падзеі, каб любіць і шанаваць сваю Радзіму, развіваць яе духоўную сферу.

## СЛОВА Ў ЭФІРЫ: КАМУНІКАТЫЎНЫЯ РЫЗЫКІ І ВЕРБАЛЬНЫ КОД СУЧАСНАСЦІ

**В. І. Іўчанкаў**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

На пасяджэнні круглага стала «Чысціня слова – чысціня душы», арганізаванага Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой у канцы мінулага года, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін вельмі слушна заўважыў: «Слова ад Бога стваральнае. Місія слова – благаслаўляць, радаваць, ствараць дабро. Але яго творчая моц можа быць накіравана і на нядобры бок. Брыдкае слова нясе ў свет зло, памнажаючы яго. У ім гучыць гнеў і апаганьванне. Яно разбурае ўнутраны мір, пашкоджваючы розум, псіхічнае здароўе як тых, хто яго агучвае, так і тых, на каго яно накіравана. Мова – душа народа, аснова яго культуры. Выкарыстанне нячыстых слоў разбурае галоўнае багацце – унутраную чысціню, цнатлівасць і маральнасць грамадства». Даўно хацелася пачуць такія словы з вуснаў святара…

Па выніках абмеркавання балючага для сучаснага грамадства пытання былі прыняты рэкамендацыі, сутнасць якіх зводзіцца да